вания прямых, а также портфельных инвестиций, развивать инфраструктуру инвестиционного рынка (инвестициональные, страховые, гарантийные, пенсионные фонды);
- создать эффективную информационную систему, которая включала бы наличие банка данных для различных инвесторов по производственному потенциалу республики, проведение семинаров, конкурсов;
- создать временно особо льготные условия инвестирования для инвесторов дальнего зарубежья, законодательно гарантировав при этом права приобретения, отчуждения имущества зарубежным инвесторам.

Комплексный подход к решению проблем, накопившихся в настоящее время в строительстве Беларуси, временное установление приоритетов организационных и финансовых в его пользу даст мощный импульс активизации всей инвестиционной деятельности в республике и позволит стать строительству тем локомотивом, который обеспечит динамичное движение народно-хозяйственного комплекса к параметрам нового состояния.

## СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ


1. Бонцевич Н.В. Бонцевич Д.Н. Социально экономическое развитие ипотечного кредитования // Белорусский экономический журнал № 1, 2004.
2. Заико Л. Подъемная сила нового строительства // Восток +Запад. Дело № 10, 2002.
3. Седов Н.Г., Виноградов А.Н. Экономика строительства. М., 1970.
4. Где деньги на обновление основных фондов // Восток+Запад. Дело № 4, 2003.
5. Народное хозяйство Беларуси в 1988 году. Статистический сборник. Минск, 1989.
6. Исследовать проблемы и разработать предложения по повышению эффективности функционирования строительного комплекса в условиях развития рыночных отношений // Отчет НИИ Минэкономики Республики Беларусь НИЭИ/ Минск, 2001.


УДК 37. 013. 46

***Кавалевіч М.С.***

# ТЭНДЭНЦЫІ Ў ВЫВУЧЭННІ ПРАЦЭСАЎ ПРАФЕСІЙНАГА САМАВЫЗНАЧЭННЯ МОЛАДЗІ

Для задавальнення запытаў індустрыяльнага грамадства цэнтральнай катэгорыяй тэарэтычных асноў вырашэння праблемы прафесійнага выбару выступала паняцце прафесійнай арыентацыі. Яе семантычнае значэнне падкрэслівала знешні характар уздзеяння на маладога чалавека, які вызначаў шляхі прафесійнага станаўлення.

Класічнымі ў тэорыі прафесійнай арыентацыі моладзі сталі работы П.Р.Атутава, Я.М.Бабосава, Ю.К.Васільева, А.Я.Галамштока, М.М. Захарава, Л.А.Йовайшы, В.А.Палякова, А.Д.Сазонова, В.Ф.Сахарава, С.М.Чысцяковай, Б.А.Федарышына. Яны ўнеслі значны ўклад у развіццё педагогікі эпохі індустрыяльнага грамадства.

Дзякуючы праведзеным вучонымі даследаванням распрацаваны політэхнічныя асновы адукацыі, створана выхаваўчая канцэпцыя прафесійнай арыентацыі, апрабавана сістэма прафесійнай арыентацыі ва ўмовах планавай сацыялістычнай эканомікі, абгрунтавана неабходнасць сістэмнага падыходу ў даследаванні праблемы прафесійнай арыентацыі.У работах гэтага перыяду акцэнт рабіўся на аказанне дапамогі асобе аптанта ў прафесійным самавызначэнні ў адпаведнасці з яе здольнасцямі і з улікам рынку прафесій, задачамі развіцця канкрэтных прафесійных якасцяў

Паралельна з пераходам грамадства на новы этап развіцця змест паняцця прафесійнай арыентацыі падвяргаўся перайначванням. Перш за ўсё гэта праявілася ў пераасэнсаванні ступені актыўнасці самога вучня ў працэсе прафесійнага выбару. У той час як большасць аўтараў (Н.А.Галушка, М.І.Калугін, К.К.Платонаў, В.П.Парамзін, В.Д.Сазонаў, В.Д.Сіманенка, В.А.Федарышын) характарызуюць прафесійную арыентацыю як уздзеянне на асобу школьніка, шэраг даследчыкаў пачынае падкрэсліваць яе актыўны, дзейны характар. Так, у пабудаванай Л.А. Йовайша статычнай мадэлі сістэмы прафесійнай арыентацыі рэалізуюцца тры накірункі: развіццё прафесійнага вопыту і прафесійнай накіраванасці вучняў; парады педагогаў пры прафесійным самавызначэнні; работа з вучнямі, што выбралі прафесію, кантроль за правільнасцю выбару. Вучоны апраўдана робіць акцэнт на першы накірунак і ўводзіць у сістэму прафесійнай арыентацыі новы кампанент прафесійную актывізацыю, якая патрабуе ўключэння навучэнцкай моладзі ў прафесійна значымую дзейнасць. Станоўчае ў гэтай сістэме тое, што суб'ектам выбару з'яўляецца сам вучань, таму што менавіта ён адказны перад сабою і перад грамадствам за выбар уласнага прафесійнага шляху [6]. Прафесійная актывізацыя як элемент сістэмы прафесійнай арыентацыі дзейнічае і ў сістэме, прапанаванай В.Ф. Сахаравым , С.М. Чысцяковай .

Такія погляды сведчаць аб пераасэнсаванні характару працэсу прафесійнай арыентацыі: аб адказе яго трактоўкі ў якасці аднабаковага ўздзеяння і пераходзе да разумення яго як узаемадзеяння роўнаадказных удзельнікаў. Гэта паслужыла зыходным палажэннем да ўвядзення ў кантэкст разгляду сутнасці прафарыетацыйнай работы паняцця “асоба вучня”. Дадзены факт можна лічыць афіцыйным сведчаннем прызнання парытэту асобасных і грамадскіх патрэб у сферы прафесійнага выбару. Так, эксперты ЮНЭСКА прафарыентацыю разумеюць як "дапамогу асобе ў выкарыстанні ўласных асаблівасцяў, прадстаўленне ёй магчымасцяў развіваць іх так, каб яна магла выбіраць для сябе галіны адукацыі і працы ў працэсе зменлівых умоў яе жыцця ў мэтах быць, з аднаго боку, карыснай грамадству, а з другога – дасягнуць самарэалізацыі” [18, с. 37].

Акрамя таго, выкарыстанне катэгоры “асоба” абумовіла неабходнасць пашырэння зместу паняцця прафарыентацыйнага ўзаемадзеяння. Напрыклад, В.П.Зінчанка і Б.Г.Мешчаракоў акрамя агульна прынятых элементаў прафесійнай арыентацыі (прафесійная асвета, прафесійнае выхаванне, прафесійная кансультацыя), уключаюць у сістэму прафарыентацыйнай работы прафесійнае развіццё і падтрымку прафесійнай кар'еры [13]

Сістэмны разгляд сутнасці прафесійнай арыентацыі дазваляе асэнсаваць яе ролю ў рэалізацыі адукацыйных тэндэнцый постіндустрыяльнага грамадства. У гэты адносінах заслугоўвае ўвагі пазіцыя японскага вучонага С.Фукуямы, які вызначае прафесійную арыентацыю як складаную, многапланавую з'яву, у якой спалучаюцца эканамічныя працэсы з сацыяльнымі, адукацыйныя з псіхалагічнымі. Прафесійная арыентацыя разглядаецца С.Фукуямай як неад'емная частка бесперапыннай адукацыі [16].

Разам з тым, негледзячы на адзначаныя мадыфікацыі аналізуемага паняцця, становіцца відавочным, што тэрмін

"прафесійная арыентацыя" не можа ў поўнай меры адлюстраваць актыўны ўнутрыасобасны характар працэсу прафесійнага выбару, а, значыць, у кантэксце распрацоўкі тэарэтычных асноў вырашэння дадзенай праблемы не можа заставацца цэнтральнай катэгорыяй. Гэта стала прычынай выцяснення паняцця прафесійнай арыентацыі на перыферыю сферы вывучэння праблемы прафесійнага выбару.

У гэтай сувязі Ю.В.Уккэ адзначае, што "прафесійная арыентацыя – гэта практыка дапамогі асобе ў вызначэнні ёю свайго працоўнага шляху, звязаная з аб'ектыўным і суб'ектыўным бокам прафесійнага развіцця, але ў большай ступені адрасуецца да прафесійнага самавызначэння, якое ў канечным ліку, з'уляецца яе мэтай" [15, с. 52]

Такім чынам, цэнтральнае месца ў тэарэтычным кантэксце праблемы прафесійнага выбару заняла катэгорыя «прафесійнае самавызначэнне». Формы, метады, змест прафарыентацыйнай работы набылі вытворны характар і сталі разглядацца ў якасці сродкаў кіраўніцтва прафесійным самавызначэннем.

Адбылося гэта зусім невыпадкова, а пад уздзеяннем постіндустрыяльных тэндэнцый грамадскага развіцця. Карэнныя сацыякультурныя змяненні запатрабавалі ад сучаснага чалавека самавызначэння амаль ва ўсіх сферах грамадскай практыкі, уключыўшы палітыку, эканоміку і культуру, і, безумоўна, адукацыю. У сувязі з гэтым востра ўзрасла актуальнасць філасофскіх і навуковых тлумачэнняў феномена самавызначэння. У філасофскай і псіхалагічнай літаратуры з'явілася вялікая колькасць даследаванняў гэтага накірунку.

У шырокім кантэксце праблема самавызначэння аналізуецца ў рамках праблематыкі выбару жыццёвага шляху, усведамлення жыццёвых сэнсаў, фарміравання і развіцця жыццёвага поля асобы, г.зн. жыццёвага самавызначэння. Жыццёвае самавызначэнне разглядаецца сучаснымі вучонымі як серыя задач, якія грамадства ставіць перад асобай і якія ёй трэба вырашыць (Я.А.Клімаў), як канструяванне чалавекам свайго "жыццёвага поля" (М.Р.Гінзбург), як працэс фарміравання індывідуальнага стылю дзейнасці (Я.А.Клімаў), як працэс самапраектавання асобы (Л.М. Міціна), усведамленне Сэнсу жыцця (Б.С.Гершунскі). З'уляючыся паняццем інтэграваным, самавызначэнне трактуецца як "патрэба ў знаходжанні свайго месца ў агульнай плыні жыцця", "пошук мэты і сэнсу свайго існавання", патрэба зліць у адзіную сэнсавую сістэму агульныя ўяўленні пра свет і пра сябе самога і тым самым знайсці сэнс уласнага існавання [2, с.381-388].

Н.У.Кавалёва асноўнымі крытэрыямі самавызначэння лічыць узровень разумення асобай сэнсу жыцця [9]. Цікавым з'яўляецца пункт гледжання В.Э.Чудноўскага, які разглядае сэнс жыцця як асобае псіхічнае ўтварэнне, што недапускае непасрэднага падпарадкавання чалавека "знешняму" і "унутранаму", разумее яго як ідэю, што ўтрымлівае ў сабе мэту жыцця чалавека, "прысвоеную" ім і стаўшую для яго каштоўнасцю вельмі высокага парадку" [19, с.15]. І.С.Кон адзначае практычную значнасць патрэбы для чалавека "мысліць сваё жыццё не як серыю выпадковых, разрозненых падзей, а як цэласны працэс, які мае пэўны накірунак, пераемнасць і змест" [10, с.205]. Праблема сэнсу жыцця – гэта праблема асэнсавання чалавекам сваіх магчымасцяў, пастаноўкі рэальных мэтаў. Даследчыкі адзначаюць, што чалавеку характэрны шэраг жыццёвых сэнсаў. В.Франкл піша: "Сэнс – гэта ўсялякі раз таксама і канкрэтны сэнс канкрэтнай сітуацыі. Гэта заўсёды "патрабаванне моманту" [17, с.39]. Паняцце "жыццёвы шлях" мае на ўвазе адзінства многіх аўтаномных ліній развіцця, якія сыходзяцца, разыходзяцца, але не могуць быць зразумелымі асобна адна без другой [10, с.169]. Усе гэтыя "магчымыя сэнсы" знаходзяцца ў пэўных адносінах з галоўным жыццёвым сэнсам, які дазваляе чалавеку выконваць сваё прызначэнне на зямлі. Такім чынам, кожны чалавек мае свой сэнс, кожны павінен знайсці яго. Разам з тым, адзіны шлях яго пошукаў – шлях самарэалізацыі "Я-канцэпцыі", развіцця індывідуальнасці.

М.Р.Гінзбург уводзіць паняцце "жыццёвае поле асобы", якое ён вызначае яе "сукупнасць індывідуальных каштоўнасцяў, сэнсаў і прасторы рэальнага дзеяння – актуальнага і патэнцыяльнага – якое ахоплівае мінулае, сучаснае і будучае. З псіхалагічнага пункту гледжання мінулае існуе як вопыт, будучае – як праект, а сучаснасць – як рэальнасць" [4, с.22]. Псіхалагічнае будучае ў адносінах да псіхалагічнага сучаснага надае яму каштоўнасць або абясцэньвае яго. М.Р.Гінзбург прапаноўвае разглядаць жыццёвае поле асобы як сістэму каардынат, дзе "вертыкальная" складаючая ўяўляе ўсведамленне і існаванне яго каштоўнасна-сэнсавага адзінства, "гарызантальная" – ступень яго рэалізацыі.

Прыведзеныя палажэнні выступаюць для нас не толькі ў якасці пацвярджэння тэндэнцыі філасофска-псіхалагічнага пераасэнсавання адносін у дыхатаміі "чалавек-грамадства", але і як асновы для ўзбагачэння паняцця прафесійнага самавызначэння. У прыватнасці ў святле вышэйсказанага, асобаснае самавызначэнне можна разумець як змястоўнае канструяванне чалавекам свайго жыццёвага поля, што ўключае як сукупнасць індывідуальных жыццёвых сэнсаў, так і прастору рэальнага дзеяння – актуальнага і патэнцыяльнага. А прафесійнае самавызначэнне – гэта канструяванне "прафесійнага поля" асобы, якое ўключае сэнс прафесійнай дзейнасці і прастору яго рэалізацыі сёння і ў будучым. Патрэба ў прафесійным самавызначэнні ўяўляе сабой патрэбу ў развіцці пэўнай сэнсавай сістэмы, у якой прафесійны сэнс займае годнае месца.

Самапазнанне можна разглядаць як арыентацыю ў цэнасна-сэнсавай прасторы індывідуальнай самасвядомасці, г.зн. прысваенне пэўных каштоўнасцяў і іх асэнсаванне як уласных, а самарэалізацыю як асваенне гэтых каштоўнасцяў у пэўных відах дзейнасці. Другім паказчыкам, які характарызуе каштоўнасна-сэнсавае ядро асобы, з'яўляецца экзістэнцыяльная арыентацыя, у якую ўваходзяць значнасць праблемы сэнсу жыцця і наяўнасць рэферэнтных асоб па гэтым пытанні. Пазітыўнае сэнсава-каштоўнаснае ядро характарызуецца наяўнасцю экзістэнцыяльнай арыентацыі (праблема сэнсу жыцця з'яўляецца важнай, ёсць рэферэнтныя асобы), а негатыўная – яе адсутнасцю (праблема сэнсу жыцця не з'яўляецца важнай, рэферэнтных асоб няма). Псіхалагічная будучыня забяспечвае сэнсавую і часавую перспектыву асобы. Адпаведна ў якасці структурных кампанентаў псіхалагічнай будучыні выступае сэнсавая будучыня і часавая будучыня (уласнае планаванне). Важным паказчыкам сэнсавай будучыні па М.Р.Гінзбургу з'яўлецца вызначанасць сэнсавай будучыні, якая аб'ядноўвае ў сабе дакладнасць выбару прафесіі і ўстойлівасць гэтага выбару [4]. У сувязі з гэтым структураванасць уласнай будучыні сучасным старшакласнікам з'яўляецца ў нашым даследаванні адным з паказчыкаў паспяховага прафесійнага самавызначэння.

Праблема самавызначэння разглядаецца айчыннымі вучонымі ў сувязі з даследаваннем жыццёвага шляху. Пры гэтым пад паняццем "прафесійны жыццёвы шлях" маюць на ўвазе шлях па ступенях майстэрства, відах дзейнасці, карысных як для чалавека, так і для грамадства [8]. Даследчыкі падкрэсліваюць, што гэты шлях не можа быць пройдзены ў адрыве ад узаемаадносін чалавека з акаляючым светам, так як яго адносіны да самога сябе ў значнай ступені залежаць ад яго адносін да тых, хто акаляе і тых, хто акаляе, да яго.

Па Л.І.Бажовіч, самавызначэнне абапіраецца на ўстойлівыя інтарэсы і імкненні, мае на ўвазе ўлік сваіх магчымасцяў і знешніх абставін, звязана з фарміраваннем светапогляду і выбарам прафесіі, накіравана ў будучыню. Яно адбываецца ў двух планах: у плане дзелавога выбару прафесіі і праз пошук сэнсу свайго існавання. У работах Л.І.Бажовіч самавызначэнне разглядаецца як асобаснае новаўтварэнне старэйшага школьнага ўзросту, звязанае з фарміраваннем

унутранай пазіцыі дарослага чалавека, з асэнсаваннем сябе як члена грамадства, з неабходнасцю рашаць праблемы сваёй будучыні. Яно "характарызуецца не толькі разуменнем самога сябе – сваіх магчымасцяў і імкненняў, але і разуменнем свайго месца ў жыцці" [2, с. 120]. Такім чынам, жыццёвае самавызначэнне – гэта, з аднаго боку, складаны і працяглы працэс пошуку сэнсу ўласнага жыцця ўвогуле і прафесійнага, у прыватнасці, асэнсаванне сябе як члена грамадства. З другога боку, гэта асобаснае новаўтварэнне юнацкага ўзросту, патрэба ў знаходжанні свайго месца ў жыцці.

Асоба, якая самавызначылася, гатовая функцыянаваць у сістэме грамадскіх адносін, яна асэнсавала свае імкненні, магчымасці, талент, а таксама патрабаванні грамадства. Прафесійнае самавызначэнне ў псіхолага-педагагічным аспекце – найбольш значны, сістэмаўтваральны кампанент развіцця, найважнейшая састаўная частка, ядро жыццёвага самавызначэння. Яно ўключае прафесійную накіраванасць і самапазнанне, суаднясенне асобай сваіх уяўленняў пра прафесію, якую выбірае і свае магчымасці для рэалізацыі выбару. Разам з тым, гэта і дзейнасць чалавека, накіраваная на пошук шляхоў, спосабаў пабудовы прафесійнага жыцця і далейшага прафесійнага ўдасканалення і развіцця, працэс фарміравання асобай сваіх адносін да працоўнага асяроддзя і спосаб самарэалізацыі ў ім, выбар прафесіі індывідам у рамках пэўнай сацыяльнай групы, працэс прыняцця асобай рашэння аб выбары працоўнай дзейнасці – кім стаць, да якой сацыяльнай групы належаць, дзе і з кім працаваць.

Характэрнымі асаблівасцямі выбару прафесіі як акта прыняцця рашэння з'яўляюцца: высокая адказнасць па прычыне жыццёвай важнасці прымаемага рашэння; непрадказальнасць з дастатковай дакладнасцю ўсіх вынікаў прынятага рашэння; унікальнасць сітуацыі прыняцця рашэння для асобы; вялікая колькасць фактараў выбару, якія неабходна ўлічваць, і недахоп інфармацыі аб іх; недастатковая сфарміраванасць крытэрыяў выбару прафесіі; вялікі ўплыў сацыяльнага асяроддзя; працягласць працэсу прыняцця рашэння. Гэтыя асаблівасці рашэння задачы выбару прафесіі трэба мець на ўвазе педагогу-прафкансультанту, які аказвае педагічную падтрымку аптанту ў сітуацыі выбару.

Прыведзеныя палажэнні падкрэсліваюць ідэю цэласнасці і адзінства асобаснага і прафесійнага развіцця (Л.І.Бажовіч, В.В. Барцалкіна, Я.М.Барысава, Я.А.Клімаў, А.К.Маркава, Л.М Міціна, Р.М.Шаміёнаў). Сутнасць ідэі заключаецца ў тым, што асобаснае і прафесійнае развіццё непадзельныя. Прынцып самаразвіцця вызначае поспех асобаснага і прафесійнага станаўлення, творчай самарэалізацыі. Дынаміка псіхалагічнай гатоўнасці да прафесійнага самавызначэння ўзгадняецца з логікай асобаснага развіцця. Выбар прафесіі і авалоданне ёю радыкальна мяняюць сацыяльную сітуацыю развіцця асобы, уплываюць на развіццё яе здольнасцяў, матывацыйна-патрэбаснай сферы, інтарэсаў, каштоўнасных арыентацый. Рэалізацыя ідэі цэласнасці і адзінства асобаснага і прафесійнага развіцця патрабуе стварэння ўмоў для гарманічнага развіцця асобы на этапе прафесійнага самавызначэння. Асобасныя характарыстыкі (устаноўкі, патрэбы, інтарэсы, узровень дамаганняў) значна ўплываюць на паспяховасць прафесійнага самавызначэння. Яны могуць як садзейнічаць паспяховаму прафесійнаму самавызначэнню, так і запавольваць яго. Сталасць асобы з'яўляецца перадумовай таго, каб чалавек здзейсніўся як прафесіянал.

Прафесійнае станаўленне асобы, пачынаючы з працэсаў самавызначэння, з'яўляецца самым працяглым перыядам у жыцці чалавека, які развіваецца па індывідуальнаму сцэнарыю, мае сваю ўласную траекторыю прафесійнага жыцця. Тут выдзяляюць наступныя этапы: 1-4 клас: развіццё працалюбства і інтарэсу да выбару прафесіі; азнаямленне з найбольш даступнымі прафесіямі; 5-7 клас: развіццё патрэбы ў самавызначэнні, станаўленне інтарэсаў і схільнасцяў; 8-9 клас: развіццё прафесійнай самасвядомасці, асэнсаванага намеру і выбар шляхоў працягвання адукацыі; 10-11 клас: развіццё перакананасці ў адэкватнасці зробленага выбару; падрыхтоўка да рэалізацыі прафесійнага намеру [14, с. 8]. Іншыя даследчыкі адрозніваюць: этап эмацыянальна-вобразнага ўспрыняцця свету прафесій – людзей працы , іх заняткаў, фарміравання першапачатковых працоўных уменняў у даступных відах дзейнасці (старэйшы дашкольны ўзрост); прапедэўтычны этап, калі фарміруецца любоў да працы, разуменне яе ролі ў жыцці чалавека і грамадства, паяўляецца цікавасць да прафесій бацькоў і бліжэйшага акружэння
(1-4 класы); пошукавы этап, калі падлеткі ўсведамляюць свае інтарэсы, здольнасці, грамадскія каштоўнасці спрабуюць сябе ў розных відах дзейнасці (5-8 класы); перыяд развіцця прафесійнага самавызначэння, з'яўлення асобаснага сэнсу выбару прафесіі, суаднясення грамадскіх мэтаў са сваімі ідэаламі (8-9 класы) і этап удакладнення сацыяльна-прафесійнага статуса з улікам папярэдняга вопыту, фарміравання прафесійна важных якасцяў, карэкціроўкі прафесійных планаў, самападрыхтоўкі і самаразвіцця ( 9-11 класы)

Як бачым, асновы будучай прафесійнай дзейнасці закладваюцца задоўга да прафесійнай адукацыі. Прычым, прафесійнае самавызначэнне – гэта не мяжа ў развіцці асобы, а толькі памяншэнне нявызначанасці ўяўленняў пра прафесійную будучыню, што адкрывае новыя магчымасці прафесійнага развіцця і самаўдасканалення сябе як суб'екта працы, будучага прафесіянала [8, с.38]. Такое развіццё, акрамя прафесійнага самавызначэння, уключае таксама прафесійную падрыхтоўку, прафесійную адаптацыю, развіццё прафесійнага майстэрства або фарміраванне прафесійных намераў; прафесійнай падрыхтоўкі; прафесійнай адаптацыі; прафесіяналізацыі – рэалізацыя асобы ў прафесійнай дзейнасці (частковая або поўная).

У адпаведнасці з ідэяй адзінства асобаснага і прафесійнага развіцця прафесійнае самавызначэнне – важная падзея на жыццёвым шляху чалавека. Трэба падкрэсліць, што яно звязанае не толькі з мінулым вопытам асобы, але і працягваецца далёка ў будучыню, удзельнічае ў фарміраванні вобразу "Я", прадвызначае ў канчатковым выглядзе многія бакі жыцця . Рашэнне аб выбары прафесіі прымае актыўная асоба, якая ўсведамляе сваю адказнасць за паспяховае выкананне дзейнасці і рэалізацыю сваіх здольнасцяў.

С.М. Чысцякова падкрэслівае актыўны і працяглы характар прафесійнага самавызначэння, бо яно "... гэта працэс фарміравання асобай сваіх адносін да прафесійна-працоўнага асяроддзя і спосаб яе самарэалізацыі, састаўная частка цэласнага жыццёвага самавызначэння. Гэты працяглы працэс узгаднення ўнутрыасобасных і сацыяльна-прафесійных патрэб не завяршаецца прафесійнай падрыхтоўкай па абранай спецыяльнасці, адбываецца на працягу ўсяго жыццёвага і працоўнага шляху"[11, с. 33]. Пытанні актывізацыі асобы ў прафесійным самавызначэнні разглядаюцца з розных бакоў: як патрэба маладога чалавека ў асэнсаванні ўласных якасцяў і магчымасцяў у сувязі з задачамі вызначэння жыццёвага шляху: (Л.І. Бажовіч), шматмерны, многаступенчаты, доўгачасовы працэс: (Т.В. Кудраўцаў, В.Ю. Шэгурава), станаўленне, развіццё суб'екта дзейнасці на стадыі аптацыі (Я.А. Клімаў).

Прафесійнае самавызначэнне цесна звязваецца з каштоўнасцямі асобы, яны маюць з ім агульны механізм развіцця. Каштоўнасці з'яўляюцца элементам самасвядомасці, характарызуюцца сумесным праяўленнем кагнітыўнага, эмацыянальнага і нарматыўнага элементаў. Важнейшым элементам каштоўнасцяў побач з ведамі з'яўляецца перакананне ў тым, што яны ёсць аб'ект жаданняў і імкненняў чалавека. "...каштоўнасныя планы ўяўляюць аснову чалавечых дзеянняў і галоўны крытэрый выбару, які ажыццяўляецца …" [7, с.14]. Праблема каштоўнасна-сэнсавай прыроды самавызначэння

працягвае развівацца ў даследаваннях Я.А.Галавахі, М.Р.Гінзбурга, М.С.Пражнікава. Самавызначэнне, з'яўляецца паняццем інтэграваным, выступае перш за ўсё як каштоўнасна-маральнае ўтварэнне. Якім чалавек стане, якую пазіцыю зойме ў грамадстве ў першую чаргу залежыць ад яго светапоглядных установак. Трэба падкрэсліць асаблівую важнасць гэтага палажэння ва ўмовах пераходнага перыяду, які характарызуецца дыскрыдэтацыяй і стратай многіх маральных арыенціраў.

М.М.Захараў характырызуе прафесійнае самавызначэнне як важнае грамадска значнае дзеянне, якое адбываецца пад уплывам унутрана прынятых асобай каштоўнасных арыентацый. "Таму вядучай дзейнасцю асобы ў яе прафесійным самавызначэні з'яўляецца каштоўнасна-арыенціровачная дзейнасць, якая звязвае паводзіны і самасвядомасць асобы з сацыяльным заказам грамадства [5, с.78]. Такім чынам, каштоўнасна-арыенціровачную дзейнасць можна разглядаць як сродак прафесійнай арыентацыі.

Важным паказчыкам пасяховага самавызначэння з'яўляецца здольнасць асобы самастойна выпрацоўваць прынцыпы ўласнага жыцця, знаходзіць яго сэнс. Пасяховае самавызначэнне характарызуецца наяўнасцю дастаткова шырокага спектру асобасна значных пазітыўных каштоўнасцяў, а непасяховае – вузкага спектру або яго адсутнасцю. Суб'ектыўна пасяховае самавызначэнне характарызуецца перажываннем асэнсаванасці ўласнага жыцця, а непасяховае – перажываннем яго бессэнсоўнасці. Ад пасяховасці жыццёвага самавызначэння і перш за ўсё прафесійнага непасрэдна залежыць праблема жыццяздольнасці асобы, з якой сутыкнулася наша грамадства. Такім чынам, паняцце "жыццёвае прафесійнае самавызначэнне" можна характарызаваць як працэс мэтанакіраванага пошуку асобай жыццёвых сэнсаў і мэтаў у тым ліку і прафесійных, жыццёвай стратэгіі і тактыкі, якая дазваляе вырашаць аптымальна свае прафесійныя задачы, яно характарызуе чалавека як суб'екта ўласнага жыцця, суб'екта прафесійнай дзейнасці, які развівае свае сілы і здольнасці. Вынік жыццёвага прафесійнага самавызначэння – выхад чалавека на мэты і сэнсы, накірункі і спосабы самарэалізацыі, здольнасць праз мэтамеркаванне самастойна знайсці і рэалізаваць сваё чалавечае прызначэнне.

Абазначаная ідэя асобасна-прафесійнага развіцця чалавека знайшла сваё адлюстраванне ў тым факце, што ў якасці сістэмастваральнага кампанента самавызначэння ўвогуле і прафесійнага самавызначэння ў прыватнасці разглядаецца самасядомасць. Свядомасць з'яўляецца цэнтрам, у якім інтэгруюцца ўсе псіхалагічныя новаўтварэнні, у тым ліку і такое сістэмнае новаўтварэнне юнацкага ўзросту як "самавызначэнне". Развіццё самасвядомасці ўяўляе сабой працэс пазнання і асэнсавання суб'ектам самаго сябе як адзінага цэлага, які здольны і імкнецца да самавыяўлення. Таму важнейшым крытэрыем завершанасці прафесійнага самавызначэння з'яўляецца ўзровень развіцця самасвядомасці. Развіццё прафесійнай самасвядомасці з'уляецца неабходнай умовай пасяховага самавызначэння асобы на розных этапах яе прафесійнага станаўлення. Работы Б.Г.Ананьева, Л.І.Бажовіч, С.Л.Рубінштэйна сведчаць, што высокі ўзровень развіцця самасвядомасці з'яўляецца важнай прадумовай фарміравання асэнсавана рэгулюемых паводзін асобы.

Даследуючы прафесійную самасвядомасць чалавека як суб'екта прафесійнай дзейнасці, вучоныя вызначаюць гэтае паняцце, як выяўлянне накіраванасці, актыўнасці суб'екта на самога сябе ў мэтах прафесійнага самаўдасканалення, дасягнення прафесійнага ідэалу. І.С.Кон прапанаваў узроўневую канцэпцыю самасвядомасці, выкарыстоўваючы паняцце ўстаноўкі. Самасвядомасць асэнсоўваецца як установачная сістэма, якая ўключае тры кампаненты: кагнітыўны, афектыўны і кампанент паводзінаў [10]. Аналагічная структура выдзяляецца і ў прафесійнай самасвядомасці. Змест прафесійнай самасвядомасці раскрываецца праз адносіны да сябе як суб'екта ўласнай прафесійнай дзейнасці, якія развіваюцца і рэалізуюцца ў працэсе ўзаемадзеяння індывіда з акаляючым асяроддзем. Як паказвае аналіз прафесійнай самасвядомасці, узаемадзеянне асобы з акаляючым асяроддзем праяўляецца ў прысваенні ведаў аб свеце прафесій і прафесіяналаў і ўключае "увесь арсенал ведаў чалавека пра сябе".

Прафесійная самасвядомасць характарызуецца пэўнымі адносінамі да ведаў пра свет прафесій і пра сябе. Гэтыя адносіны выяўляюцца на эмацыянальна-ацэначным узроўні. Асноўнымі характарыстыкамі самаацэнкі з'яўляюцца яе ўстойлівасць, дыферэнцаванасць, узровень асэнсаванасці і адэкватнасці. Устойлівасць самаацэнкі праяўляецца ў яе незалежнасці, нязменнасці пры зменлівых умовах. Устойлівасць самаацэнкі садзейнічае зберажэнню веры ў сябе, свае сілы. Асоба з няўстойлівай самаацэнкай канформна, вельмі залежна ад меркаванняў другіх людзей, знаходзіцца пад іх уплывам. У такім выпадку на выбар уплываюць бацькі, сябры, старэйшыя таварышы. Але як адзначаюць даследчыкі, устойлівасць самаацэнкі не бывае абсалютнай і дапаўняецца дынамічнасцю: змяненнем, развіццём, самаўдасканаленнем. Адэкватнасць самаацэнкі з'яўляецца важнай характарыстыкай, што адлюстроўвае якасны бок самаацэнкі. Л.Ф.Мірзаянава ў сваім даследаванні механізмаў апярэджваючай адаптацыі даказала эфектыўнасць "высокай адэкватнай самаацэнкі", пазітыўных адносін да зробленага прафесійнага выбару, пазітыўнай дынамікі ўяўленняў пра будучую прафесійную дзейнасць, разумнай незадаволенасці сабою [11, с. 51].

Спецыфіка эмацыянальна-ацэначнага кампанента самасвядомасці асобы заключаецца ў ацэнцы сваёй прафесійнай прыдатнасці. Пад прафесійнай прыдатнасцю разумеюць сукупнасць псіхічных і псіхафізіялагічных асаблівасцяў чалавека, неабходных і дастатковых для дасягнення грамадска прымальнай эфектыўнасці ў той ці іншай прафесіі. Калі паміж патрабаваннямі прафесіі і псіхікай чалавека ёсць адпаведнасць, ён засвойвае яе больш пасяхова, працуе з задавальненнем.

Кагнітыўны і эмацыянальна-каштоўнасны кампаненты цесна звязаныя з самарэгуляваннем асобай розных псіхічных актаў, што ўваходзяць у састаў дзейнасці і паводзін. Самарэгуляцыя асобы ўяўляе сабой складаную псіхічную з'яву, якая мае ўзроўневую будову і адносна самастойную логіку і разглядаецца як неабходная ўмова прафесійнага самавызначэння. У вызначэнні ўзроўню самарэгуляцыі ёсць некалькі падыходаў. К.А.Абульханава-Слаўская выдзяляе тры ўзроўні самарэгуляцыі, якія ўяўляюць сабой суадносіны знешняга (патрабаванні да выканання дзейнасці) і ўнутранага (якасці асобы): на першым узроўні – асоба ўзгадняе свае асаблівасці з нормамі дзейнасці, на другім – удасканальвае якасці дзейнасці шляхам аптымізацыі сваіх магчымасцяў, на трэцім – асоба як суб'ект дзейнасці выпрацоўвае самастойную лінію паводзін, праяўляючы творчы характар дзейнасці [1].

У замежнай літаратуры, у прыватнасці англамоўнай, найбольш блізкім да паняцця самавызначэнне з'яўляецца паняцце асабаснай ідэнтычнасці (Personal identity). E.Erikson, які стаіць у вытокаў вывучэння ідэнтычнасці, вызначае яе набыццё як псіхалагічную задачу старэйшага падлеткавага і юнацкага ўзростаў. Развіццё ідэнтычнасці разумеецца як "працэс, укаранёны і ў індывіду, і ў культуры, які вызначае "ідэнтычнасць гэтых ідэнтычнасцяў". Пачуццё ідэнтычнасці дапамагае індывіду авалодаць праблемамі дзяцінства і фарміруе гатоўнасць тварам да твару сустрэцца са складанасцямі дарослага свету. Яно абазначае асобае пачуццё адзінства са сваім сацыяльным асяродкам, пры якім, аднак, чалавек не "раствараецца" ў ім, ён адчувае сваю самастойнасць, аўтаномнасць, пачуццё валодання ўласным "Я", здольнасць да вырашэння жыццёвых задач. Гэтае пачуццё патрэбна, каб прымаць дарослыя рашэнні. Палярнае пачуццё называюць дыфузным. Палярнасць

гэтых пачуццяў павінна быць вырашана ў падлеткавым узросце, каб папярэдзіць парушэнні ў дарослацці.

Старэйшы падлеткавы ўзрост з'ўляецца перыядам "самастандартызацыі", маладыя людзі імкнуцца да пошуку пачуцця "Я", да ўключанасці ў канкрэтныя сацыяльныя ролі. Патрэба ў набыцці пачуцця ідэнтычнасці з'яўляецца настолькі вострай, што чалавек можа вырашыць яе стаўшы рэліквентам, выбраць антыграмадскую ідэнтычнасць. Асноўнымі кампанентамі пачуцця ідэнтычнасці па Erikson з'яўляюцца: часавая перспектыва (супрацьлегласць – часавая дыфузія); упэўненасць у сабе (супрацьлегласць – апатыя); эксперыментаванне з ролямі (супрацьлегласць – негатыўная ідэнтычнасць); прадугадванне поспеху (супрацьлегласць – параліч працоўнай дзейнасці); палавая ідэнтычнасць (супрацьлегласць – бісексуальная дыфузнасць); лідэрская ідэнтычнасць (супрацьлегласць – дыфузія ўлады); ідэалагічная ідэнтычнасць (супрацьлегласць – дыфузія ідэалаў). Вынікам неадэкватнай ідэнтычнасці можа быць размыванне пачуцця часу, няздольнасць будаваць жыццёвыя планы, страх дарослацці і змен, размыванне прадуктыўных, творчых здольнасцяў, няўменне рэалізаваць свае ўнутраныя рэсурсы і сканцэнтравацца на нейкай галоўнай дзейнасці; фарміраванне "негатыўнай ідэнтычнасці", адказ ад самавызначэння і выбар адмоўных узораў для пераймання [20].

Паслядоўнік Erikson P.Weinreich асноўную ўвагу надзяляе часаваму аспекту ідэнтычнасці і вызначае ідэнтычнасць як цэласнасць самаканструявання, у якой тое, як чалавек канструіруе сябе ў цяперашні час, выражае пераемнасць паміж тым, як ён канструіруе сябе такім, якім ён быў у мінулым часе і як ён канструіруе сябе такім, якім ён спадзяецца стаць у будучым. Th.Luckmann, даследуючы ідэнтычнасць, падкрэслівае, што адным з састаўных элементаў ідэнтычнасці з'яўляецца рэфлексіўная свядомасць, якая забяспечвае пэўную ступень свабоды ад асяроддзя .

У эксперыментальных даследаваннях асобаснай ідэнтычнасці прынята выдзяляць 4 узроўні яе сфарміраванасці:

1. "Дыфузная ідэнтычнасць" або "размытая ідэндычнасць" абазначае, што індывід яшчэ не зрабіў адказнага выбару і не ўступіў у перыяд крызісу.
2. "Прадвырашанасць" – "датэрміновая ідэнтычнасць" азначае, што індывід ужо ўключыўся ў "дарослую сістэму адносін", але зрабіў гэта не самастойна, не прайшоўшы перыяд крызісу і выпрабаванняў.
3. "Мараторый" азначае, што юнак знаходзіцца ў працэсе самавызначэння, выбірае з мноства варыянтаў адзін, свой.
4. "Спелая ідэнтычнасць" азначае, што крызіс завершаны і індывід перайшоў ад пошукаў да практычнай самарэалізацыі.

Узроўні ідэнтычнасці можна разглядаць як этапы развіцця асобы і разам з тым яе тыпы. Як правіла, юнак з "дыфузнай ідэнтычнасцю" падымаецца на ўзровень "мараторыя", а затым і "спелай ідэнтычнасці". Але ён можа застацца на этапе прадвырашанасці" і не ўключыцца ў самастойны этап выпрабаванняў, адказацца ад актыўнага выбару і самавызначэння. Важна мець на ўвазе, што "дыфузная ідэнтычнасць" і "датэрміновая ідэнтычнасць" звязаны з меншай інтэлектуальнай самастойнасцю, асабліва пры вырашэнні складаных задач. Датэрміновасць дае таксама самыя высокія вынікі на аўтарытарнасць і самыя нізкія – на самастойнасць. Самы высокі ўзровень маральнай самасвядомасці характарызуе людзей, што знаходзяцца ў стадыі "мараторыя" або "спелай ідэнтычнасці". Заўважана, што ідэнтычнасць развіваецца перш за ўсё ў працэсе прафесійнага самавызначэння. Th.Luckmann прыйшоў да высновы, што маладыя людзі з добра развітай асабістай ідэнтычнасцю лепш спраўляюцца з жыццёвымі задачамі, лепш сябе адчуваюць і кантактуюць з іншымі людзьмі.

У даследаваннях H.Niemi паказаны ўяўленні фінскіх школьнікаў пра сэнс жыцця і жыццёвыя мэты. Вучоны ўстанавіў, што ад выбару чалавекам установак і каштоўнасцяў залежыць асэнсаванасць яго жыцця. Маладыя людзі, якія знайшлі сэнс жыцця, больш станоўча адносяцца да сваіх штодзённых абавязкаў, больш актыўныя і больш паспяхова спраўляюцца з жыццёвымі задачамі, чым тыя, у каго адсутнічае сэнс у жыцці ("экзістэнцыяльны вакуум") . Такім чынам, замежныя даследаванні паказваюць сувязь асобаснай ідэнтычнасці з сацыяльнымі каштоўнасцямі, адносінамі да гэтых каштоўнасцяў, са станаўленнем часавай перспектывы і сэнсу жыцця.

Увогуле, вынікі філасофска-псіхалагічнага асэнсавання праблемы выбару чалавекам жыццёвага і, у прыватнасці, прафесійнага шляху могуць выступаць у якасці пладатворнай асновы яе вырашэння ў вобласці тэорыі і практыкі педагогікі.

Больш падрабязны аналіз поля псіхалагічных даследаванняў, прысвечаных раскрыццю праблемы станаўлення прафесійнага самавызначэння, дазваляе выдзеліць тры галоўныя тэарэтычныя падыходы да яе вырашэння. Першы вынікае з ідэі стабільнасці і практычнай нязменнасці індывідуальных якасцяў, ад якіх залежыць поспех прафесійнай дзейнасці. Другі падыход арыентаваны на ідэю накіраванага развіцця здольнасцяў, мяркуючы, што ў кожнага чалавека можна так ці інакш развіць неабходныя якасці. Абодва гэтых падыходы разглядаюць індывідуальнасць і прафесійную дзейнасць як незалежныя адна ад адной велічыні. Трэці падыход арыентуецца на станаўленне індывідуальнага стылю дзейнасці як індывідуальна-своеасаблівай сістэмнай арганізацыі, якая ўстойліва ўзнаўляецца пры рашэнні паўсядзённых задач, як "почарк" у рабоце [8, с. 108]. Канцэпцыя індывідуальнага стылю дзейнасці заснавана на наступных прадпасылках:

1. Існуюць стойкія, практычна неразвіваемыя асобасныя (псіхалагічныя) якасці, якія істотна ўплываюць на поспех дзейнасці.
2. Магчымыя розныя па спосабах, але раўназначныя па канчатковаму эфекту варыянты прыстасавання да ўмоў прафесійнай дзейнасці.
3. У чалавека ёсць шырокія магчымасці перадольвання слабой выражанасці асобасных здольнасцяў за кошт практыкаванняў або кампенсацыі другімі здольнясцямі або спосабамі работы.
4. Развіваць здольнасці неабходна з улікам індывідуальных асаблівасцяў асобы.

Прыведзеныя палажэнні могуць разглядацца ў якасці непасрэднай тэарэтычнай асновы для распрацоўкі педагагічных пытанняў прафесійнага самавызначэння, паколькі ўяўляюць сабою псіхалагічныя заканамернасці арганізацыі гэтага працэсу ў адукацыйнай установе. Разам з тым, у адносінах да педагагічных даследаванняў, прысвечаных праблеме арганізацыі працэсу прафесійнага самавызначэння, неабходна адзначыць дзве вельмі істотныя абставіны. Гэта, перш за ўсё, вялікую разнастайнасць прапанаваных для яе вырашэння падыходаў, па-другое, у асноўным фундаментальны характар педагагічных распрацовак. Пры гэтым, абедзве тэндэнцыі рэалізуюцца на фоне сацыякльтурнага і навуковага прызнання безумоўнай актуальнасці аналізуемай намі праблемы.

Сёння адукацыйная тэорыя і практыка пераходзяць ад парадыгмы навучання, у рамках якой чалавек выступае як "аб'ект педагагічных уздзеянняў", да парадыгмы бесперапыннай адукацыі, арыентаванай на гуманістычныя адносіны паміж удзельнікамі адукацыйнага працэсу, да сэнсастваруючай парадыгмы канструявання новых адносін, дастойных чалавека і заснаваных на Веры ў яго маральны пачатак, у яго творчы, стваральны патэнцыял.

Змена парадыгмы адукацыі ў цэлым не магла не закрануць сістэму прафесійнага самавызначэння ў прыватнасці, паколькі існуе цесная сувязь паміж адукацыяй і прафесійным самавызначэннем, якія супадаюць у сваіх мэтах, хаця адрозніваюцца ў

спосабах рэалізацыі. Выбраць накірунак адукацыі – значыць быць упэўненым у вызначэнні спосабаў прафесійнага жыцця, узбагаціць сваю асобу, навучыцца кіраваць сабою. Але ў гэтым і заключаецца функцыя адукацыі: ва ўзбагачэнні, развіцці асобы з усімі яе характэрнымі якасцямі, здольнасцямі і рэсурсамі, фарміраванні веры ў магчымасць і неабходнасць уласнай самарэалізацыі, разуменні Сэнсу жыцця. У сувязі з гэтым патрабуецца ўжо ў школьныя гады стварыць усе ўмовы для паспяховага асобаснага і прафесійнага самавызначэння, дапамагчы выпускнікам асэнсаваць адказнасць за рэалізацыю сваіх жыццёвых і прафесійных мэтаў. Толькі асэнсаванасць жыцця, яго духоўнасць робяць зразумелым неабходнасць самавызначэння, самаразвіцця, дасягнення akme.

Такім чынам, праведзены намі аналіз філасофскіх, псіхалагічных і педагагічных работ па праблеме прафесійнага выбару, якія адносяцца да розных перыядаў грамадскага развіцця паказаў, што акцэнт накіраванасці даследаванняў працягвае перамяшчацца ад прафесійнай асветы, прафесійнага ўздзеяння на асобу да актывізацыі асобы ў яе прафесійным самавызначэнні, выхаванні адказнасці за зроблены выбар перад сабой і перад грамадствам. Гэта вызвана вялікай асобаснай і сацыяльнай значымасцю якасці прафесійнага самавызначэння для лёсу кожнага выпускніка школы і грамадства ў цэлым.

### СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Абульханова-Славская К.А. Деятельность и психология личности.– М.: Наука, 1980.– 335 с.
2. Божович Л.И. Избранные психологические труды.– М.: Межд. педагог. академия, 1995.– 209 с.
3. Божович Л.И. Личность и её формирование в детском возрасте.– М.: Просвещение, 1968.– 464 с.
4. Гинзбург М.Р. Психологическое содержание жизненного поля личности старшего подростка // Мир психологии и психология в мире.– 1995.– № 3– С. 21–28.
5. Захаров Н.Н. Профессиональная ориентация школьников.– М.: Просвещение, 1988.– 269 с
6. Йовайша Л.А. Проблемы профессиональной о риентации школьников.– М.: Педагогика, 1983.– 129 с
7. Идзиковский Б. Формирование ценностных ориентаций, влияющих на жизненную и профессиональную карьеру молодёжи в Польше.– Автореф. дис. … д-ра пед. наук: 13.00.01 / М., 1997.– 32 с.
8. Климов Е.А. Психология профессионального самоопределения.– Ростов-на-Дону: Изд-во "Феникс", 1996.– 512 с.
9. Ковалёва Н.В. Жизненное самоопределение молодёжи в условиях социальной нестабильности: социально-психологический аспект: Дис. … канд. психол. наук: 19.00.05.– М., 1997.– 151 с.
10. Кон И.С. В поисках себя: Личность и её самосознание.– М.: Политиздат, 1984.– 335с
11. Мирзаянова Л.Ф. Упреждающая адаптация к педагогической профессии.– Барановичи: БВПК, 1999.– 366 с.
12. Профессиональная ориентация и методика преподавания в системе школа-вуз: сб. тез. докл. I регион. науч.-практ. конф., Москва, 28 янв. 2000 г. – М.: МИРЗА, 2000. – 66 с.
13. Психологический словарь / Под ред. В.П.Зинченко, Б.Г.Мещерякова.– 2-е изд., перераб– М.: Педагогика-Пресс, 1999.– 440 с.
14. Симоненко В.Д. Профессиональное самоопределение школьников: Учеб. пособие / В.Д.Симоненко, Т.Б.Суровицкая, М.В.Ретивых, Е.Д.Волохова.– Брянск: Изд-во Брянск. гос. пед. ин-та, 1995.– 99 с.
15. Укке Ю.В., Алексеев Л.П., Фарапонова Э.А. Профессиональная ориентация в системе непрерывного образования // Вестник высшей школы.– 1989.– № 1.– С. 49-52.
16. Фукуяма С. Теоретические основы профессиональной ориентации: Перевод / С.Фукуяма; Под ред. Е.Н.Жильцова, Н.Н.Нечаева.– М.: Изд-во МГУ, 1989.– 105 с.
17. Франкл В. Человек в поисках смысла: Сборник: Пер. с англ. и нем.– М.: Прогресс, 1990.– 366 с
18. Чистякова С.Н., Поляков В.А. и др. Профессиональное самоопределение молодёжи // Педагогика.– 1993.– № 5.– С.33-37.
19. Чудновский В.Э. Смысл жизни: Проблема относительной эмансипированности от "внешнего" и "внутреннего" // Психологический журнал.– 1995.– Т. 16.– № 2.
20. Erikson E.H. Identity: Youth and Crisis.– New York, 1968.– 336 p.


УДК 65:338.242

***Матвейчук В.***

# УСЛОВИЯ ФУНКЦИОНИРОВАНИЯ И ТЕНДЕНЦИИ РАЗВИТИЯ СОВРЕМЕННОГО СТРОИТЕЛЬНОГО РЫНКА В ПОЛЬШЕ

Коренные изменения в строительном комплексе Польши произошли в начале 1990-ых годов. Эти изменения коснулись всех функциональных сфер строительства – технической, экономической и организационно-правовой.

Внедрение нового экономического механизма, опирающегося на свободный рынок и конкуренцию, чёткое ограничение доминирования государства в сфере хозяйствования, открытое международное сотрудничество, особенно в технологической сфере, создали возможности для осуществления перемен в инвестиционном секторе и в самом строительстве. Об масштабах происшедших изменений свидетельствует показанная на рис.1 динамика инвестиционных вложений, объемов производства строительной продукции и занятости в строительстве Польши за период с 1990г. по 2002г.

Специфика инвестиционного процесса и готовой продукции строительного комплекса вызывает разнообразное поведение рынка, на которое должны реагировать функционирующие в нём субъекты. Функционирование строительного рынка обуславливают ряд элементов, которые в общем можно разделить на три основные группы:

- *элементы, связанные с общей экономической ситуацией в стране;*
- *элементы, связанные с регулированием правовой и налоговой системами;*
- *текущая внутренняя ситуация в строительном комплексе.*

Элементы **общей экономической ситуации в стране**, которые имеют значительное влияние на формирование условий функционирования предприятий, - это, прежде всего, *слабость государственных финансов* с высоким бюджетным дефицитом в стране, *повышение безработицы*, а также *снижение инфляции*. Масштаб представленных процессов в Польше настолько велик, что позволяет говорить об экономическом застое. Началом этих явлений можно считать 1999-2000гг., когда наступило резкое ослабление роста национального дохода, а также надлом в строительном рынке, приведший к резкому снижению инвестиционных вложений. Следующий год принёс дальнейшее углубление рецессии, что очень явно отразилось на функционировании инвестиционно-строительного рынка.

***Матвейчук Веслав,** Политехника Белостоцка, Республика Польша.*